УДК 811.161.3–367

Бяззлучнікавы сказ са значэннем паяснення ў складзе беларускіх літаратурных афарызмаў

Шпакоўская Вікторыя Аляксандраўна
старшы выкладчык кафедры замежных моў
Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
vika_sp79@mail.ru

Анатацыя. У тэксце апісваюцца бяззлучнікавыя сказы са значэннем паяснення ў складзе беларускіх літаратурных афарызмаў. За аснову была ўзята класіфікацыя паводле семантычна-сінтаксічных адносін паміж састаўнымі часткамі. У данным артыкуле апісваецца чатыры разнавіднасці бяззлучнікавых сказаў са значэннем паяснення ў складзе беларускіх літаратурных афарызмаў.

Ключавыя словы: бяззлучнікавы сказ, афарызм, паясненне, каменціруючая частка, дапаўняючы кампанент, удакладненне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Abstract. The text describes asyndetic sentences with the meaning of explanation as a part of Belarusian literary aphorisms, the classification of semantic-syntactic relations between clauses of these sentences being taken as the basis. This article describes four types of asyndetic sentences with the meaning of explanation, which are typical for the Belarusian literary aphorisms.

Keywords: asyndetic sentence, aphorism, explanation, commenting part, supplementing component, clarification.

Для даследавання было ўзята каля 3000 афарыстычных выслоўяў знакамітых пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў Беларусі [1]. З іх беларускіх літаратурных афарызмаў, якія прадстаўлены складанымі сказамі, налічваецца прыкладна 1500 адзінак (55,0%). З іх вылучаецца прыкладна 100 афарызмаў, якія сінтаксічна выражаны складаназлучаным сказам і гэта складае 13% ад агульнай колькасці прааналізаваных адзінак. Для характарыстыкі афарызмаў, якія з'яўляюцца складаным бяззлучнікавым сказам, намі была ўзята за аснову класіфікацыя паводле семантычна-сінтаксічных адносін паміж састаўнымі часткамі. Афарызмы, якія з'яўляюцца бяззлучнікавымі сказамі са значэннем паяснення складаюць 4% ад агульнай колькасці прааналізаваных адзінак. Афарызмы, выражаныя сказамі такога тыпу, падзяляюцца на наступныя разнавіднасці.

Афарызмы, якія з'яўляюцца бяззлучнікавымі сказамі са значэннем семантычнага разгортвання складаюць 0,3%. Спецыфіка такіх сказаў – у своеасаблівай узаемасувязі лексічнага элемента першай часткі з усёй другой часткай. Паясняльная функцыя другой часткі заключаецца ў разгортванні зместу выказніка першай часткі, які выражаецца такім словам, лексічная прырода якога нацэльвае на развіццё думкі, пачуцця, на называнне таго, што ўспрымаецца [2, с. 311], напр.: *Вер, брат, жыццё залатое / Будзе ў нашай старане (Я. Колас); Дбаючы разам з векам /Аб электронным цудзе, / Памятай – / чалавекам / Ніхто за цябе не будзе (П. Макаль); Даўно ўжо людзі прадказалі: / Нішто не вечна паміж намі (П. Броўка)*. Сустракаюцца афарызмы, дзе другая частка разгортвае змест усёй першай часткі, у даным выпадку першая частка з'яўляецца безасабовым сказам, напр.: *Бывае й так: і ў добрым севе / Трапляе дзікая трава (Я.Колас)*.

Афарызмы, якія з'яўляюцца бяззлучнікавым сказам з каменціруючай часткай, складаюць 0,3%. Каменціруючая частка робіць паведамленне больш зразумелым. Галоўным паказчыкам такіх сказаў з'яўляецца парадак размяшчэння частак: у пачатку стаіць той кампанент, які паясняецца, а потым – той, які паясняе [2, с. 315], напр.: *Як каноплі ў балоце тапіці – / так жыць: не любіці (В. Аколава)*; *Жыцця ніколі не бывае многа, / Так, як і праўды, – колькі ні жыві (С. Законнікаў)*.

Афарызмы, якія з'яўляюцца бяззлучнікавым сказам з дапаўняючым кампанентам, складаюць 0,4%. У аснове сэнсавых адносін паміж часткамі такіх сказаў ляжыць выражэнне дадатковай заўвагі да таго, пра што сказана раней.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дапаўняльны кампанент расшырае думку сказа дадатковымі звесткамі пра асоб, прадметы, дзеянні. Другая частка такіх сказаў можа развіваць адзін з членаў першай часткі ці ўсю першую частку ў цэлым [2, с. 315]. Менавіта другая частка прааналізаваных афрызмаў у асноўным дапаўняе сэнс усёй першай часткі. Гэта звязана перш за усё з такой рысай афарызма як абагульненне, напр.: *Увесь час варушымся, збіраем, / Канца ж патрэбам тым не маем (Я. Колас); Чаму ж тады дарога дамоў / Карацейшая, як з дому, / Аб чым знае нават конь (М. Танк); Кінь саромецца мовы сваёй, / Зваць сябе беларусам пачні (М. Чарот); Пражыць, як гаворацъ, – не поле прайсці, / Вучыцца не позна ніколі (П. Броўка).*

Афарызмы, якія з'яўляюцца бяззлучнікавым сказам са значэннем удакладнення, складаюць большасць сярод афарызмаў, якія з'ўляюцца бяззлучнікавым сказам са значэннем паяснення (3%). Першая частка такіх сказаў мае ў сваім саставе словы або словазлучэнні, якія патрабуюць удакладнення, другая – фармулюе гэта ўдакладненне. Удакладняецца і тое, што ў агульнай форме было названа ў першай частцы [2, с. 313]. На падставе гэтага афарызмы, якія з'яўляюцца бяззлучнікавым сказам са значэннем удакладнення, можна падзяліць на дзве групы:

а) афарызмы, дзе другая частка ўдакладняе змест першай часткі ў цэлым. Такія афарызмы прадстаўлены ў большай колькасці, бо канкрэтазацыя ўсёй першай часткі ў цэлым мае больш выражаны абагульняльны характар, напр.: *Храбрасць – талент, стараннем яго не асвоіш (В. Быкаў); Паэзія – агонь і лёд: / Сто раз згараць і ўздымацца (Я. Янішчыц); Так ужо наканавана небам: / Маці дзеліцца з дзецьмі / Душою сваёй, як хлебам (Р. Барадулін); Жанчына – душа мужчыны; яна наша натхненніца на вялікія справы (Я. Колас)*;

б) афарызмы, у якіх другая частка ўдакладняе сэнс асобных кампанентаў або груп кампанентаў першай часткі, напр.: *І адна / ў паэтаў віна: / не ўміраюць і ў вечныя векі (М. Скобла); Толькі свет пакідаючы не бярыце нічога, / Нават ключ ад дзвярэй пакідайце суседу (М. Танк).* Больш выразна выяўляецца ўдакладненне, калі ў першай частцы ёсць параўнанне, напр.: . *Жыццё, сапраўды, як казка: / Ідзеш ад бяды да бяды (Н. Мацяш); Чалавекі як ліхтары – /У кожнага / Свечка душы ўнутры (Р. Барадулін); Мудрасць крылатая, яна, як насенне дуба, ляціць і ўкараняецца ўжо на вечнасць (Л. Геніюш).*

Першая частка такіх сказаў часцей за ўсе нагадвае двухсастаўны поўны сказ, неразвіты ці развіты заўсёды з невялікай колькасцю дададых членаў і прамым парадкам слоў, напр.: *Людское сэрца, быццам мора, / У ім бывае шторм і штыль... (П. Броўка)*; аднолькава амаль па колькасці ёсць і аднасастаўныя сказаў, напр.: *Народа няма напалову – / Ён есць ці яго няма (В.Зуёнак)*. Сярод іх нярэдка сустракаюцца і намінатыўныя сказы, напр.: *Такі закон: перад канцом сваім / І мухі тнуць балюча (Я. Колас); Смерць, яна ўсіх уроўнівае (М. Танк)*; або безасабовыя, напр.: Другая частка можа выражацца і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

двухсастаўным, і аднасастаўным сказам напр.: *Трэба любіць і сваіх адмоўных герояў – злой любоўю (Я. Сіпакоў)*; але часцей за усё гэта просты двухсастаўны сказ з невялікай колькасцю даданых членаў. Менавіта такая простая мадэль пабудовы такіх сказаў і дазваляе пры дапамозе ўдакладнення выявіць асноўную думку афарызма ў абагульняючай форме. Асобна трэба адзначыць афарызмы з гэтай групы, у якіх дзеяслоў стаіць у форме загаднага ладу, ці/і ў першай ці/і ў другой частках, таксама гэта з'яўляецца адной з прымет абагульненасці, напр.: *Пакінь адну пасаду – / Быць Чалавекам на зямлі (С. Грахоўскі); Не аддавай сябе самоце, / Заўчасна ёй не саступай (Н. Мацяш).*

Афарызмы, якія з'яўляюцца складанымі бяззлучнікавымі сказамі, складаюць прыкладна адну дзясятую частку ад агульнай колькасці прааналізаваных адзінак. Аднолькава па частотнасці сярод іх сустракаюцца сказы за значэннем паяснення, дэтэрмінацыі і супастаўляльна-супрацьпастаўляльнымі значэннямі (па 4%). Гэта абумоўлена тым, што такія сказы маюць рознафункцыянальныя часткі, якія з'яўляюцца закрытымі структурамі. Менавіта такая структура надае афарызму лаканічны і абагульнены характар.

Спіс літаратуры

1. **Шпакоўская, В.А.** Сінтаксічная структура беларускіх літаратурных афарызмаў (просты сказ) / Шпакоўская В.А. // Веснік МДПУ імя І.П. Шамякіна. – 2011. – № 1(30). – С. 111–116.
2. Беларуская граматыка : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – Ч. 2 : Сінтаксіс / рэд.: М.В. Бірыла, П.П. Шуба. – 328 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова